**Надзея Паўлава**
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

## «РАНІЦА З БЕЛАРУСКІМ РАДЫЁ» – РАНІШНІ ІНФАРМАЦЫЙНЫ КАНАЛ

Вядома, што прайм-тайм для тэлебачання – вячэрні час, для радыё – ранішні. Слухачы збіраюцца на работу, едуць у машыне, пачынаюць працоўны дзень або толькі прачынаюцца і слухаюць радыё. Таму вельмі важна распрацаваць стратэгію эфіру такім чынам, каб у гэты час гучалі самыя лепшыя праекты, папулярная музыка і вядучыя, здольныя працаваць менавіта раніцай – разбудзіць, настроіць слухача на пазітыўны лад на ўвесь дзень.

У беларускім FM-фармаце такія «ранішнія» магчымасці радыё даўно актыўна выкарыстоўваюць. Шоу ў такі час з розыгрышамі прызоў, жартамі, бадзёрай музыкай, інфармацыяй пра сітуацыю на дарогах сёння запатрабаваныя.

На Першым нацыянальным канале Беларускага радыё раніца ў прамым эфіры заўсёды пачыналася рана – пасля 6-й гадзіны гучаць апошнія паведамленні, прагноз надвор’я, потым «Сельская раніца», у 7 роўна – інфармацыйна-аналітычная праграма «Радыёфакт».

Але доўгі час адсутнічаў ранішні забаўляльны праект. У 2006 годзе пачаў выходзіць ранішні інфармацыйны канал, які гучаў з 5 да 6 гадзін. Ён быў запатрабаваны ў асноўным у тых людзей, якія працуюць у начныя змены, але не настолькі маштабна, каб раніца развівалася менавіта ў гэтым напрамку. Тым не менш два сезоны вядучыя канала кожную раніцу выходзілі ў прамы эфір. Слухачоў менш у гэты час яшчэ і таму, што вя-

шчанне па правадной сетцы пачынаецца ў 6 гадзін, да гэтага часу з поўначы Першы нацыянальны можна слухаць у FM-фармаце і інтэрнэце. У гэтай сувязі добрым стратэгічным ходам стаў перанос часу гучання – з 8 да 9 гадзін. Пра яе запатрабаванасць сведчаць шматлікія СМС-паведамленні і тэлефанаванні ў эфір. З 5 да 6 гадзін па-ранейшаму гучыць «Раніца з Беларускім радыё», але ў аблегчаным фармаце, самае цікавае пакідаюць на другую гадзіну праграмы.

Вялікая ўвага нададзена музычнаму афармленню праграмы. Фонавая музыка, джынглы, адбіўкі – аўтарскія, напісаныя спецыяльна для гэтай праграмы з улікам часу гучання, канцэпцыі канала, падачы матэрыялу вядучымі і карэспандэнтамі. Па-аўтарску аформлена і кожная рубрыка, якая выходзіць у эфір.

Прынцыповая адметнасць ранішняй праграмы на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё – у інфармацыйнай насычанасці і адпаведнай «ранішняй» падачы матэрыялу карэспандэнтамі і вядучымі, у адрозненне ад многіх ранішніх праграм на FM-станцыях, на якіх эфір запоўнены бадзёрымі словамі і музыкай.

Сёння ў структуры праграмы «Раніца з Беларускім радыё» рубрыкі: «Сакрэты добрага настрою», «На сувязі Гідраметэацэнтр», «Аўтанавіны», «Смачна есці», «Стыль», «Парады спажыўцам», «Афіша», «Рэпартаж выхаднога дня», «Ранішні эцюд», «Высокія тэхналогіі» і іншыя, якія дакладна размеркаваны па днях выхаду – кожны дзень гучаць апошнія навіны і інфармацыя для дзелавых людзей. У той жа час у праграме – ранішнія прывітанні слухачоў, віншаванні з нагоды адметных дат.

У такім складаным спалучэнні – добрыя магчымасці для ранішніх праграм беларускага радыёэфіру. Аналагаў гэтай ранішняй перадачы ў радыёэфіры знайсці цяжка. Сапраўды, нялёгка спалучыць у адной праграме бадзёры настрой раніцы, дастакова сур’ёзную падачу навін, па-журналісцку прыгожа падвесці рэпартаж, шчыра і добрай музычнай кампазіцыяй павіншаваць слухача-імянінніка. Пры гэтым неабходна вытрымаць праграму ў адным ключы. Для гэтага патрэбна, каб вядучы, гукарэжысёр, карэспандэнты, якія рыхтуюць рубрыкі, музычны рэдактар былі настроены на адзін лад – ранішні. Дадаць да гэтага яшчэ некалькі важных складнікаў – і можна было б весці размову пра з’яўленне якасна новага накірунку ў беларускім ранішнім радыёэфіры. Але гэта задача на перспектыву, як і пошук новых форм падачы матэрыялу, больш поўнае выкарыстанне жанравай палітры, тэматычнай і інфармацыйнай насычанасці. Асноўная мэта Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё – рабіць раніцу цікавай, бадзёрай, інфармацыйна насычанай як мага для большай колькасці слухачоў.